РАШЭННЕ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ
24 снежня 2020 г. № 259

# Аб перайменаванні і прысваенні найменняў сastaўным часткам г. Мінска

На падставе абзаца трэцяга пункта 2 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16 лістапада 2010 г. № 190-З «О наименованиях географических объектов» Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў ВЫРАШЫЎ:

1. Перайменаваць вуліцу Лівенцава і надалей называць яе «праезд Адэ́скі» («проезд Оде́сский»).

2. Прысвоіць найменні наступным састаўным часткам г. Мінска:

2.1. праектуемай вуліцы № 1 у межах праспекта Партызанскага, вуліцы Куляшова, вуліцы Шышкіна – «вуліца Рудабе́льская» («улица Рудобе́льская»);

2.2. праектуемай вуліцы № 2 у межах праспекта Партызанскага, вуліцы Куляшова, вуліцы Шышкіна – імя партызана, Героя Савецкага Саюза Міхаіла Мармулёва і надалей называць яе «вуліца Міха́ла Мармулё́ва» («улица Миха́ила Мормулё́ва»);

2.3. праектуемай вуліцы № 4 у межах праспекта Партызанскага, вуліцы Куляшова, вуліцы Шышкіна – імя партызана, Героя Савецкага Саюза Віктара Лівенцава і надалей называць яе «вуліца Ві́ктара Лі́венцава» («улица Ви́ктора Ли́венцева»);

2.4. праектуемай вуліцы № 1 (III кальцо), працягу вуліцы Станіслава Манюшкі, – імя кампазітара Станіслава Манюшкі і надалей называць яе «вуліца Станісла́ва Маню́шкі» («улица Станисла́ва Моню́шко»);

2.5. праектуемай вуліцы № 7 на тэрыторыі аб’екта «Экспериментальный многофункциональный комплекс «Минск-Мир» – імя заслужанага архітэктара Беларускай ССР Леаніда Левіна і надалей называць яе «вуліца Леані́да Ле́віна» («улица Леони́да Ле́вина»);

2.6. праектуемай вуліцы № 8 на тэрыторыі аб’екта «Экспериментальный многофункциональный комплекс «Минск-Мир» – імя народнага мастака СССР, Героя Беларусі Міхаіла Савіцкага і надалей называць яе «вуліца Міха́іла Саві́цкага» («улица Миха́йла Сави́цкого»);

2.7. праектуемай вуліцы № 12 на тэрыторыі аб’екта «Экспериментальный многофункциональный комплекс «Минск-Мир» – імя кампазітара, народнага артыста СССР Ігара Лучанка і надалей называць яе «вуліца І́гара Лучанка́» («улица И́горя Лученка́»).

3. Дадзенае рашэнне падлягае абнародаванню (апублікаванню) у газеце «Минский курьер».

4. Дадзенае рашэнне ўступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Старшыня** **А.А.Бугроў**